**Д. А. Гулак**

# КРЫНІЦЫ ФАРМІРАВАННЯ ВОБРАЗА ДЖЭРЫ НАНАПУША Ў РАМАНАХ Л. ЭРДРЫХ ЦЫКЛА «ЧАРАЎНІЦТВА КАХАННЯ»

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*daminika.hulak@yandex.by;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

У артыкуле вызначаюцца гісторыка-біяграфічныя і этнакультурныя крыніцы фарміравання вобраза Джэры Нанапуша – аднаго з пратаганістаў раманаў Л. Эрдрых з цыкла «Love Medicine Series». Характарызуецца біяграфічная аснова вобраза Джэры Нанапуша, яго ідэйны змест і шляхі мастацкага ўвасаблення Л. Эрдрых архетыпа трыкстара на прыкладзе дадзенага вобраза.

***Ключавыя словы***: Л. Эрдрых; Нанапуш; цыкл раманаў; вобраз; правобраз; аўтабіяграфічнасць; архетып; трыкстар; вуснамоўны аповед.

Луіза Карэн Эрдрых — адна з найбольш вядомых постацяў сучаснай літаратуры паўночнаамерыканскіх індзейцаў. Сярод публікацый пісьменніцы паэтычныя зборнікі, зборнікі кароткай прозы, дакументальная літаратура і дзіцячыя творы, аднак найчасцей Л. Эрдрых узгадваецца як аўтарка буйной прозы. Мастацкі свет раманаў Л. Эрдрых – рэзервацыя племені аджыбуэяў, да якога належыць і сама пісьменніца. *Аджыбуэі* (англ. Ojibwa), вядомыя таксама як *чыпіўэі* і *анішынаабэ* – народ, які адносіцца да Алганкінскай групы карэнных народаў Паўночнай Амерыкі і насяляе рэзервацыі на тэрыторыі паўночных ЗША і на поўдні Канады.

Восем раманаў, якія ўваходзяць у цыкл «*Love Medicine Series*» (1983–2006), склалі аснову пісьменніцкага рэнамэ Л. Эрдрых – «Love Medicine» (1984), «The Beet Queen» (1986), «Tracks» (1988), «The Bingo Palace» (1994), «Tales of Burning Love» (1997), «The Last Report on the Miracles at Little No Horse» (2001), Four Souls (2004), «The Painted Drum» (2005). У раманах «Чараўніцтва кахання» пісьменніца распрацоўвае сямейную хроніку супольнасці аджыбуэяў з выдуманай рэзервацыі Літл Ноў Хорс у часавым прамежку з пачатку XX да пачатку XXI стст.

Сярод асноўных характарыстык мастацкага метаду прозы Л. Эрдрых варта назваць выразную аўтабіяграфічнасць (шматлікія адсылкі да асабістай

сямейнай гісторыі аўтаркі), перайманне і адаптацыю тэхнік індзейскага вуснамоўнага аповеду, шырокае выкарыстанне інструментаў магічнага рэалізму.

Разгледзім вобраз Джэры Нанапуша – аднаго з пратаганістаў раманнага цыкла «Love Medicine Series». Герой фігуруе ў першай («Love Medicine», 1984) і чацвёртай («The Bingo Palace», 1994) кнігах. Паводле ўнутранай храналогіі цыкла, падзеі, звязаныя з Джэры, адбываюцца ў 80–90х гг. XX ст. Вобраз Джэры ўражвае шматпланавасцю – з аднаго боку, герой вызначаецца антысацыяльнасцю і дэзадаптацыяй у грамадстве: «Gerry's problem, you see, was he believed in justice, not laws» [3, с. 201]. Развіццё сюжэтнай лініі Джэры адпавядае цыклу, дзе герой адбывае пакаранне ў турме або хаваецца ад пераследу ўладаў пасля ўцёкаў і непазбежна зноў трапляе за краты. З іншага боку, Джэры застаецца паважаным членам племяннай супольнасці і стае адным з сімвалаў імкнення супляменнікаў да суверэнітэту. Канструюючы вобраз Джэры, Л. Эрдрых звяртаецца да гісторыка-біяграфічных і этнакультурных крыніц.

Сюжэтная лінія Джэры Нанапуша выкарыстоўваецца для раскрыцця тэмы недасканаласці прававой сістэмы і яе дыскрымінацыйнага стаўлення да карэннага амерыканца. Біяграфічную аснову вобраза Джэры складае гісторыя Леанарда Пельцье (англ. *Leonard Peltier*, 1944), карэннаамерыканскага грамадскага актывіста, які адбывае пакаранне за забойства і паводле пашыранага меркавання з'яўляецца несправядліва асуджаным. Постаць Л. Пельцье звязаная з адной з найбольш сумна вядомых старонак гісторыі Руху амерыканскіх індзейцаў. Рух амерыканскіх індзейцаў (англ. *American Indian Movement*, 1968) – радыкальная паніндэанісцкая арганізацыя, якая дзейнічала на тэрыторыі Паўночнай Амерыкі. Сярод уласных мэтаў прадстаўнікі Руху называлі абарону правоў карэннага насельніцтва ў рэзервацыях і гарадах, іх эканамічнай незалежнасці, адраджэнне традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры індзейцаў, а таксама барацьбу з расізмам і самавольствам паліцыі. У 1975 г. Л. Пельцье стаў сведкам і ўдзельнікам узброенага сутыкнення паміж актывістамі Руху і супрацоўнікамі ФБР у мястэчку Аглала. Падчас страляніны былі забітыя два агенты ФБР, у забойстве якіх абвінавачаны Л. Пельцье. Асуджаны ў 1977 г., Л. Пельцье адбывае прызначаны тэрмін да 2035 г.

Л. Пельцье, як і Л. Эрдрых, належыць да племені Turtle Mountain Chippewa. Пісьменніца неаднаразова выказвалася па справе актывіста і вы-

ступала ў падтрымку яго вызвалення. Акрамя таго, аўтарка вяла з асуджаным актыўную перапіску. У 2000 г. Л. Эрдрых піша ў Нью-Ёрк Таймс: «As long as Leonard Peltier is imprisoned, our country's relationship with its Native people is stained by ongoing dishonor, and our own human rights statements are undermined by hypocrisy» [2].

Варта адзначыць, што грамадская кампанія за вызваленне Л. Пельцье зрабіла актывіста адным з найбольш вядомых аджыбуэяў. Арганізацыя «Міжнародная амністыя» (англ. *Amnesty International*) выказвала сумнеў у справядлівасці судовага працэсу над актывістам. Апроч «Міжнароднай амністыі», за перагляд справы і ў падтрымку Л. Пельцье выступалі Еўрапейскі парламент, парламенты Бельгіі, Італіі і Канады, Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека, а таксама больш за 500 грамадскіх дзеячаў, выбітных навукоўцаў і артыстаў. Шэраг акцый у падтрымку Л. Пельцье ладзіўся ў Савецкім Саюзе.

Згаданыя вышэй факты дазваляюць правесці паралелі паміж фікцыянальным Джэры Нанапушам і яго правобразам – Л. Пельцье. Паводле сюжэта Джэры з'яўляецца былым членам Руху, справа якога прыцягвае шырокую ўвагу і выклікае хвалю салідарнасці ў індзейскай супольнасці: «The famous Chippewa who had songs wrote for him, whose face was on protest buttons, whose fate was argued over in courts of law, who sent press releases to the world» – так характарызуе героя адзін з апавядальнікаў у рамане «The Bingo Palace» [4, с. 352]. Адзначым, што біяграфія Л. Пельцье ўключае ўцёкі з турмы ў 1979 г. Як і ў героя Л. Эрдрых, спроба пазбегнуць пакарання не была паспяховай для Л. Пельцье – ён быў адшуканы і затрыманы праз тры дні, і ў выніку агульны тэрмін пакарання быў павялічаны на сем год. Утрыманне Джэры за кратамі звязанае не з першапачатковым правапарушэннем, здзейсненым героем, а са шматлікімі спробамі ўцёкаў.

Іншай крыніцай фарміравання вобраза Джэры Нанапуша з'яўляецца міфапаэтычная спадчына аджыбуэяў. Сістэма персанажаў цыкла «Love Medicine Series» уключае шэраг герояў і гераінь, якія носяць прозвішча Нанапуш і Піладжар – сярод іх Стары Нанапуш (англ. *Old Man Nanapush*), Лулу Нанапуш (маці Джэры) і інш. Адзначаныя персанажы не толькі з'яўляюцца спадкаемцамі прозвішча, але і пераймаюць спецыяльную сацыяльную характарыстыку клана, якая адпавядае архетыпу трыкстара.

Імя *Нанапуш* адсылае да вобразу Нанабоза (англ. *Nanabozho*, *Nanabush*) – героя, які фігуруе ў касмаганічных і этнаганічных міфах аджыбуэяў і іншых народаў Алганкінскай групы [1, с. 395]. Нанапуш спалучае якасці

культурнага героя – міфалагічнага персанажа, які дабывае або ўпершыню стварае для людзей розныя прадметы культуры, навучае майстэрствам і становіцца першапродкам, – і трыкстара – камічна-дэманічнага дублёра культурнага героя, які дасягае поспеху хітрасцю. Героі-трыкстары ў Л. Эрдрых вылучаюцца праявамі звышнатуральных здольнасцяў, якія яны рэалізуюць у формах, адпаведных сучасным сацыяльным рэаліям.

У выпадку Джэры Нанапуша праявай звышнатуральнай прыроды героя выступае яго надзвычайная здольнасць пераадольваць фізічныя перашкоды на шляху да свабоды: «In previous breakouts, Gerry Nanapush has foiled guards, shrunk himself through an opening no larger than a pie box, somehow managed to torque himself into the body of a truck that drives through the gates with him clinging underneath <...> Yes, this is Gerry No-shit-barn-built-can-hold-a Chippewa Nanapush» [4, с. 232]. Пры гэтым Джэры падчас перабывання на волі імкнецца падтрымліваць сямейна-родавыя сувязі – стварае сям'ю, знаёміцца з дарослым сынам і гэтак далей: «Gerry knew where he belonged – out of prison, in the bosom of his new family» [3, с. 202].

Такім чынам, да крыніц фарміравання вобраза Джэры Нанапуша ў раманах цыкла «Love Medicine Series» належаць гісторыка-біяграфічныя звесткі пра актывістаў Руху амерыканскіх індзейцаў, факты іх судовага праследу і рэакцыя грамадзянскай супольнасці на працэс супраць іх. Этнакультурнай крыніцай выступае традыцыя індзейскага вуснамоўнага аповеду.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Тишков В. А.* Оджибве // Народы и религии мира: Энциклопедия / Гл. ред. В. А Тишков, Редкол. : О. Ю Артемова [и др.]. М.: Большая Российская энциклопедия, 1999. С. 395–396.

2. *Erdrich L.* A Time for Human Rights on Native Ground. URL: www.nytimes.com/2000/12/29/opinion/a-time-for-human-rights-on-native-ground.html (дата звароту: 20.04.2021).

3. *Erdrich L.* Love Medicine / Louise Erdrich. London : Harper Collins, 1984.

4. *Erdrich L.* The Bingo Palace / Louise Erdrich. NY : HarperPerennial, 1995.